УДК 102.4

# Нацыякультурная абумоўленасць гісторыі

Анцыповіч М. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Як казалі ў старажытнасці: «Historia est magistra vitae» – «гісторыя – настаўніца жыцця». А вучыць нас гісторыя таму, што, напрыклад, Шэкспір пісаў свае знакамітыя драмы не для ўсяго чалавецтва. І нават не для Еўропы, а ўсяго толькі для свайго лонданскага тэатра «Глобус». І па-англійску, а не на міфічнай «усечалавечай» мове. Таксама дзеялі заўсёды і ўсе іншыя пісьменнікі, мастакі, музыкі. Пагэтаму, калі свядомасць пазбаўляецца культурнага карэння свайго народа, ён трансфармуецца ў абязлічаную масу з механічным перайманнем замежнай культуры і мастацтва, чым будзе спрыяць сутыкненню культур, заўсёды цягнучую за сабой раздвойнасць асобы, дэвальвацыю нацыянальных каштоўнасцей.

Нацыянальную самасвядомасць трэба разумець не як самасвядомасць нацыі, якая ўяўляе сабой «калектыўную істоту», а як самасвядомасць асобнага чалавека, які ўсвядамляе сваю датычнасць да пэўнай нацыі, гэта значыць да тых людзей, хто мае «аднародную будову духоўнага вопыту».

Нацыянальныя каштоўнасці трансфармуюцца ў агульначалавечыя, калі іх стваральнік – народ – сцвярджае сябе ў якасці гістарычнай нацыі. Паводле доктара філасофіі У. Конана,  Беларусь у прыватнасці пойдзе па шляху які бачыўся яе сыну – прароку І. Канчэўскаму (І.Абдзіраловічу) як сінтэз лепшых здабыткаў – уласнабеларускіх, «заходніх» і «усходніх».

Родная мова можа быць на нейкі час гвалтоўна выціснута з ужытку іншай мовай, але адметныя рысы  нацыянальнага характару ад  гэтага, тым не менш, кардынальна не вельмі мяняюцца. Зазірнуць у глыбіню самога сябе - гэта рэфлексія; плёнам рэфлексіі выступае філасофія як вышэйшая ступень спасціжэння народам самога сябе, яе візітоўка пры сумоўі  культур.

Памяць – псіхічная здольнасць да ўзнаўлення мінуўшага вопыта, як асабістага, так і нацыянальнага. Гэта адна з уласцівасцей нервовай сістэмы: магчымасць працяглы час захоўваць інфармацыю аб падзеях знешняга свету, рэакцыях арганізма, і шматкроць уводзіць іх у сферу свядомасці і паводзінаў.

Філасофія робіцца нацыянальнай тады, калі ўздымаецца да раскрыцця і выражэння асноўных пошукаў нацыянальнай душы. Гістарычны вопыт народа, яго культура, вобраз жыцця, здзяйсняе істотны ўплыў на спосаб ўзнаўлення рэальнасці ў нацыянальнай мове. Нацыякультурная абумоўленасць гісторыі з’яўляецца відавочнай.